Ірына КЛІМКОВІЧ

# КАБ ЖЫЦЬ БЕЛАРУСКІМІ ДУМАМІ...

*Нашаму народу пашанцавала, яго велічную душу апявала шмат песняроў, зачараваных легендарнай спадчынай. Усе яны пакінулі непаўторны след у беларускай літаратуры. Але заўсёды ў кожнага народа вылучаюцца постаці самыя галоўныя, якія зрабілі асаблівы ўнёсак у развіццё літаратуры, творчасць якіх набыла сусветнае гучанне. Англічане маюць Уільяма Шэкспіра, латышы — Яна Райніса, украінцы — Тараса Шаўчэнку, венгры — Шандара Пецёфі, рускія — Аляксандра Пушкіна... У нас да такіх паэтаў належыць Янка Купала, побач з яго імем мы ставім імёны Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Але фенаменальнасць Янкі Купалы менавіта ў тым, што ён абудзіў нацыянальную самасвядомасць народа, калі беларусы даўно ўжо страцілі дзяржаўнасць і развітыя формы палітычнага і эканамічнага жыцця. Па глыбокім перакананні паэта-прарока, толькі літаратура здольная была абудзіць спаралізаваны дух народа, кансалідаваць яго лепшых прадстаўнікоў вакол нацыянальнай ідэі. Усё жыццё беларускага песняра было прысвечана адраджэнню Бацькаўшчыны, талентам трыбуна ён клікаў «з путаў на свабоду, з цемры да святла», вучыў «любіць свабоду, родны край і мову». Яму належаць словы: «Не толькі блізкасць да народа, з якім я падзяляў гора і радасць, але і народная творчасць, з якой я пазнаёміўся, рабілі на мяне свой уплыў у сэнсе развіцця фантазіі ў тым кірунку, каб жыць беларускімі думамі».*

*Постаць вялікага паэта, яго творы насычаны дзівоснымі вобразамі, у якіх — фантастычны свет нашых продкаў, маляўнічыя мясціны, звязаныя з Янкам Купалам, заўсёды натхнялі беларускіх мастакоў.*



*Янка Купала. 1904 г.*



*Янка Купала. 1908 г.*



*Янка Купала. 1941 г.*

## «Я ДОБРАЙ ДОЛЯЙ ПОСЛАН К ВАМ...»

Шмат хто з айчынных скульптараў звяртаўся да вобраза беларускага песняра. Калі трапляеш у Літаратурны музей Янкі Купалы, здзіўляюць сваёй дакладнасцю ў перадачы знешняга вобліку два гіпсавыя бюсты паэта, створаныя **Уладзімірам Летуном** — майстрам у галінах манументальнай і станковай скульптуры. Ён аўтар помнікаў-бюстаў П. Гаўрылаву ў Брэсце, І. Дварчанінаву ў г. Дзятлаве Гродзенскай вобласці, А. Багдановічу ў мястэчку Халопенічы Мінскай вобласці, В. Бялыніцкаму-Бірулі ў Магілёве. Стварыў таксама скульптурныя партрэты А. Пушкіна, У. Мулявіна. Цяпер Уладзіміра Летуна няма сярод жывых. Гледзячы на маладога Купалу У. Летуна ўзгадваеш раннія вершы, дзе паэт яшчэ не ўсведамляе сябе выказнікам народных дум: «Я не сокал зоркавокі, // Не арол адважны, // Што так думна за аблокі // Узносіцца іх кажны. Нават я не салавейка, // Што пяе так слаўна, // А я толькі верабейка, // Ўзрошчаны над Гайнай». І ўжо зусім іншыя радкі паэта, упэўненага ў прарочую моц сваёй паэзіі: «За мной, за мной, забраны людзе! // Я добрай доляй послан к вам // І знаю, што было, што будзе, // І вас у крыўду не аддам!» Такой дакладнасці ў выяўленні вобліку народнага песняра ўдалося дасягнуць бадай што толькі Анатолю Анікейчыку.



*Уладзімір Лятун.*

Вобраз паэта-прарока як сімвала Незалежнасці і Адраджэння, вобраз яго паэзіі, што расквітнела папараць-кветкай, мы бачым і ў іншых скульптурных працах, якія захоўваюцца ў літаратурным музеі. Гэта выявы Янкі Купалы, выкананыя **Паўлам Лукам** і **Валяр'янам Янушкевічам**. Павел Лук падае нам народнага песняра ўжо далёка не маладога, але такога ж натхнёнага і свабодалюбівага, як і ў самым пачатку творчага лёсу. Яго ўзвышаная постаць сведчыць пра высакароднасць душэўных памкненняў народнага трыбуна, веліч яго спадзяванняў на лепшую будучыню беларуса. Павел Лук звярнуўся да Купалы і ў іншай сваёй працы. Гэта бронзавая скульптурная кампазіцыя «Дрэва беларускага пісьменства» — разгалінаваны дуб, на якім месцяцца вобразы з мастацкіх твораў беларускай літаратуры. У тым ліку і выявы Купалавых Бандароўны і лірніка. Гэтая кампазіцыя ўпрыгожвае кругавую галерэю другога паверха новай Нацыянальнай бібліятэкі. Павел Лук працуе ў галіне станковай скульптуры і ў сваёй творчасці адлюстраваў і іншыя адметныя постаці беларускай культуры і гісторыі: Ф. Скарыны, Я. Драздовіча, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, Т. Касцюшкі, Э. Плятэр, К. Ст. Радзівіла, К. Чорнага і інш.



*Валяр'ян Янушкевіч.*



*Павел Лук.*

Сваё бачанне Янкі Купалы ў скульптурным вырашэнні ў Валяр'яна Янушкевіча. Ягоны бронзавы пясняр прыгожы, шляхетны. Побач з ім папараць-кветка, якой скульптар падкрэслівае, што Купала выбраў псеўданім нездарма, што ягоная паэзія звязана з перадгісторыяй яго народа. Майстар, які працуе ў галінах манументальнай і станковай скульптуры, вельмі добра адчувае метал. Ягоныя працы ўражваюць арыстакратычнай вытанчанасцю. Гэта і помнікі А. Міцкевічу ў Лідзе і Навагрудку, і Ф. Скарыне ў Лідзе, і М. К. Агінскаму ў Фларэнцыі, і серыя рэльефаў «Крыжовая дарога» ў касцёле Св. Роха ў Мінску, і «Беларускія легенды» для Мінскага музея валуноў. Самому Валяр'яну, які родам з мястэчка Ракаў, вобраз Янкі Купалы вельмі блізкі яшчэ і таму, што купалаўская мова, пакладзеная ў аснову сучаснай бела-



*Леў Гумілеўскі.*

рускай літаратурнай мовы, — ягоны родны дыялект. Факты з біяграфіі паэта гавораць, што яго бацькі перад нараджэннем Яся Луцэвіча жылі менавіта ў Ракаве. Вобраз Купалы Янушкевічу блізкі яшчэ і таму, што ягоныя продкі таксама, як і Луцэвічы, былі арандатарамі з дробнай шляхты.



*Сяргей Гумілеўскі.*

Усё гэта, а яшчэ пажаданне беларускай дыяспары ў Расіі ўшанаваць памяць беларускага паэта ў Маскве натхнілі В. Янушкевіча на стварэнне помніка песняру. Аднак ушанаваць памяць паэта ў Маскве было вырашана на дзяржаўным узроўні. Быў абвешчаны конкурс на лепшы праект. У выніку з пяці прапануемых прац, сярод якіх апроч В. Янушкевіча была і праца П. Лука, лепшым быў абвешчаны эскіз **Льва Гумілеўскага** і яго сына **Сяргея**. Бронзавага Купалу ў В. Янушкевіча набыў адзін з прадстаўнікоў беларускай дыяспары Антон Сабалеўскі і адвёз яго на сваю радзіму ў Глыбокае на Віцебшчыну. Ён падарыў скульптуру мясцоваму гісторыка-этнаграфічнаму музею. У Літаратурным жа музеі Янкі Купалы знаходзіцца бронзавая копія.

Скульптурны варыянт Гумілеўскіх, дзе паэт абапіраецца на стылізаваную агароджу, у якую таксама ўплецена папараць-кветка, быў устаноўлены ў 2005 г. на Кутузаўскім праспекце — адным з прэстыжных раёнаў Масквы. Праца над стварэннем вобраза вялікага паэта для народнага мастака Беларусі Льва Гумілеўскага не першая, ён быў адным з аўтараў манумента Янкі Купалы ў Мінску. Апроч вобраза Купалы стварыў такія працы, як «Мікола Гусоўскі», «У. Караткевіч», «М. Савіцкі», надмагілле Я. Янішчыц у Мінску і інш. Сяргей Гумілеўскі — стваральнік бюстаў У. Сыракомлі, Дж. Бернардоні ў гістарычным парку Нясвіжа, кампазіцыі «Дабравест», «Еўфрасіння Полацкая», «Спрадвечнае» і інш.

Гумілеўскія ўвекавечылі вобраз Купалы, калі ім былі напісаны такія выбітныя творы, як «Гусляр», «Сон на кургане». Таму бронзавага Купалу вышынёй у 5 метраў і паставілі на невялікі ўзгорак-курганчык, дзе з-пад каменя выцякае крынічка — сімвал спрадвечнага творчага натхнення. Купала задумліва глядзіць у бок сваёй Айчыны, а яго думку «Мне сняцца сны аб Беларусі» падкрэслівае надпіс на гранітным пастаменце. Афіцыйнае ж урачыстае адкрыццё помніка вялікаму беларускаму паэту, драматургу і публіцысту ў расійскай сталіцы прымеркавана да 125-годдзя з дня яго нараджэння, якое адзначаецца 7 ліпеня.

Дарэчы, усе трое вышэйзгаданыя скульптары — Павел Лук, Валяр'ян Янушкевіч і Сяргей Гумілеўскі — з аднаго курса выпуску 1987 г. Яны вучыліся ў адных і тых жа майстроў: А. Анікейчыка, А. Арцімовіча, Г. Мурамцава і З. Азгура. У свой час пра гэты курс казалі як пра адметную з'яву ў культуры Беларусі — настолькі адораныя, працаздольныя і своеасаблівыя падабраліся там хлопцы.

## ЗНАЙСЦІ САВЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ

Вобразы Купалы і ягоных літаратурных герояў, вобразы родных мясцін паэта адлюстроўваліся і ў іншым відзе выяўленчага мастацтва — жывапісе. Мастакі пераасэнсавалі асабістай творчай фантазіяй купалаўскую спадчыну. В. Шаранговіч, А. Кашкурэвіч, М. Басалыга, М. Савіцкі, У. Тоўсцік, У. Савіч і шмат хто з іншых мастакоў прапануюць нам кожны свайго Купалу.

Купалаўскія вобразы **Міколы Селешчука** створаны ім як ілюстрацыі да кнігі А. Лойкі «Як агонь, як вада». Лёс гэтага таленавітага і вельмі моднага ў 1970—1990-х гг. маладога мастака ў нечым сугучны з лёсам нашага неўміручага паэта. Абодва былі шчырымі беларусамі, абодва прысвяцілі сябе служэнню Бацькаўшчыне, увасаблялі яе вобразы ў творах, нарэшце, абодва былі інтэлігентнымі і вытанчанымі людзьмі... І адначасова самотнымі, не да канца зразумелымі суайчыннікамі. Магчыма, таму вобраз Купалы на карці-

нах мастака атрымаўся такі драматычны і трагічны. І там, дзе паэт у архітэктурных краявідах Вільні і Пецярбурга, і нават там, дзе ён на сустрэчы з Я. Коласам у Ляўках. А асобныя постаці Купалы, ягонай жонкі, Коласа, гарадскія краявіды, вясковыя хаткі быццам нараджаюцца з містычнай цемры, каб застацца назаўсёды жывымі ў нашай памяці, але ўсё роўна адасобленымі ад нас, смяротных. Больш востра і больш алегарычна за Селешчука на той час адзіноту паэта не паказаў ніхто.

Працаваў Мікола Селяшчук у станковай і кніжнай графіцы, у розных жанрах станковага жывапісу. Рабіў свае рафінаваныя ілюстрацыі да кніг «Пара любові і жалю» Я. Янішчыц, «Скарб» З. Бядулі, «Сымон-музыка» Я. Коласа, казак «Бацькаў дар», «Прагны багацей» і шмат іншых. І ўсё, што б ні ствараў мастак, у якіх бы далёкіх краінах ні вандраваў, яго жыццёвай праграмай былі словы паэта, хаця і сказаныя даўно, але блізкія па духу М. Селешчуку: «Не шукай сабе, мой братку, // З ветрам Бацькаўшчыну-матку… // Яе знойдзеш вельмі блізка, // Як знаходзіць лес вятрыска, // Толькі ў сэрца глянь сваё ты // І ў душу заглянь з ахвотай, // Знойдзеш Бацькаўшчыну блізка!»

Увекавечыў прыгожыя мясціны сваёй Бацькаўшчыны і другі адораны і рамантычны мастак Беларусі — **Міхаіл Міронаў**. Хаця некалі захапляўся ён краявідамі розных краёў. Яго шляхі пралягалі ад Сахаліна да Чэркесіі, ад Тунгускага краю да Арменіі, давялося пабываць яму і ў Грэцыі, Індыі, Францыі, Італіі, былой Югаславіі, Амерыцы… Але зноў і зноў ён вяртаўся ў Беларусь, каб пераканацца, што прыгажэй за таямнічыя фарбы роднай зямлі, нічога няма. Назвы яго краявідаў гавораць самі за сябе: «Ранішняе серабро», «Пасля навальніцы», «Нёманскія берагі», «Вячэрні звон», «Азёрны край», «Сполахі ў кастрычніку», «Селена» і інш. Вельмі любіць мастак працаваць і ў купалаўскіх мясцінах. Загадкавыя і містычныя моманты з жыцця песняра хвалююць душу мастака і, каб разгадаць хоць невялікую часцінку з іх, ён ездзіць у Ляўкі, у Яхімоўшчыну. З Ляўкамі яму пашанцавала больш, там ён бываў пераважна ў летні час, пасябраваў з супрацоўнікамі мясцовага філіяла Літаратурнага музея Янкі Купалы. Як і Купала, Міронаў з першага разу палюбіў гэты край, яго чароўныя далягляды і добразычлівых людзей. Гэта бачна і па ягоных акварэлях, прысвечаных сонечным Ляўкам.



Мікола Селяшчук.



Міхаіл Міронаў.

Зусім іншыя адчуванні агортваюць, калі глядзіш на акварэлі, створаныя мастаком у Яхімоўшчыне. Там мастак быў восенню ў дажджлівае надвор'е. Гэта адчуваецца і па змрочным небе над журботна-асірацелым будынкам жылога дома канца XIX ст., і над броварам, дзе Іван Дамінікавіч Луцэвіч ў 1907 г. жыў і працаваў памочнікам вінакура, і па апалым лісці каля будынкаў. Гэты перыяд жыцця паэта ў Яхімоўшчыне, калі напісаўся першы паэтычны зборнік «Жалейка», быў, паводле ўспамінаў самога Купалы, вельмі цяжкім і няпростым. Менавіта ў гэты час ён востра адчувае духоўную спаралізаванасць свайго краю і народа. Каб дапамагчы занядбанай айчыне, паэт спрабуе знайсці сваё месца ў грамадскім і літаратурным жыцці. Відаць, мастак адчуў і ўбачыў пераменлівую гаму пачуццяў унутраным зрокам і дакладна перадаў мінорнымі адценнямі акварэлі.

***Вось такія ўражанні выклікаюць выяўленчыя творы, што знаходзяцца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, якія нам ласкава прапанавала агледзець яго супрацоўніца Марыя Кандратаўна Чабатарэвіч. Творы з'яднаныя паміж сабой неўміручай любоўю да Бацькаўшчыны і яе прарока, якая напаўняе душу кожнага сапраўднага майстра. А непадобныя яны сваім адметным адлюстраваннем вобраза паэта і пошукам асабістых шляхоў да творчай дасканаласці. Шкада толькі, што сучасная творчая моладзь яшчэ не стварыла свайго вобраза вялікага песняра. Няўжо «змарнеў народ, забыўся», няўжо ён не ведае «як Бацькаўшчыну, і як яго завуць», і няўжо ж патрэбны новы паэт-трыбун, які б яшчэ раз прамовіў: «Паўстань, народ!.. Цябе чакае Маці-Беларусь!»***